лодзежаў у адзін дзень ад усходу да заходу сонца; рытуальныя дзеянні каля калодзежа; рытуальныя дзеянні над магіламі «нячыстых» памерлых; забароны, прымеркаваныя да свята *Дабравешчання*; паліванне, абліванне вадой і пагружэнне ў ваду людзей і розных прадметаў; аранне і капанне зямлі; разбурэнне мурашніка, забіванне жаб і інш. Сярод спец. магічных дзеянняў, накіраваных на В.д., найб. часта праводзіліся абліванне вадой, паліванне вадой праз сіта, купанне (часта прымусовае), паліванне магіл, пасыпанне макам. Ва ўсх. славян была пашырана магія каля калодзежа. У час засухі ў яго сыпалі мак, семя лёну, кідалі грошы, гліняныя гаршкі (часта лічылі неабходным, каб гаршкі былі крадзеныя), соль, лілі асвячоную ваду, мяшалі або каламуцілі ваду палкамі, вычэрпвалі з калодзежа ўсю ваду. *В.М.Шарая.*

**ВЫКЛІКАННІ**, вусны жанр дзіцячага празаічнага фальклору. Упершыню як фалькл. адзінка былі зафіксаваны ў 1990-я гг. Бытуюць на рус. мове і на «трасянцы». Аб'ектамі В. выступаюць Дамы Чорная, Пікавая, бабка-ёжка, Пушкін, Гумкавая карова, Смерць, гномік (салодкі, салёны, цукеркавы, матны), вадзянік. Важным момантам пры В. з'яўляецца выкананне пэўных дзеянняў, а таксама вера ў рэальнасць таго, што адбываецца. Напр., каб з'явілася Гумкавая карова, трэба абавязкова сесці на падлогу ў пакоі з чырвонымі занавескамі і накрыцца пакрывалам. Затым паставіць пасярэдзіне талерку, пакласці каля яе відэлец, лыжку і тройчы сказаць: «Гумкавая карова, прыходзь». Дзеці вераць, што праз некаторы час на талерачцы павінен з'явіцца салодкі пачастунак. Акрамя падарунка выкліканы персанаж можа казаць што-небудзь ці нават зрабіць шкоду, калі своечасова не прыняць меры і не загнаць яго назад.

*Літ.*: Михайлова Ю. Детский городской фольклор: традиции и новации // На хвалях філалогії: даслед. па тэорыі літ. і славян. фалькларыстыцы: зб. навук. арт. Мінск, 2002. *Т.А.Марозава.*

**ВЫКЛІЧНІК**, лексіка-граматычны клас нязменных слоў, якія выражаюць эмоцыі, пачуцці і пабуджэнні, але не называюць іх. Не маюць самаст. лексічнага і граматычнага значэння, без кантэксту не ўжываюцца. Сярод В. вылучаюцца: паводле структуры — простыя («а!», «эх!», «ух!»), састаўныя («матухны!», «дудкі!»); паводле паходжання — невытворныя («о!», «ай!», «фу!»), вытворныя («бывайце!», «здароў!», «чорт!» «плі!», «вось табе і на!»); паводле значэння — эмацыянальныя («біс!», «ай-яй!»), імператыўныя («прэч!», «баста!», «но!»), моўнага этыкету («дзень добры!», «калі ласка!», «даруйце!»). В. звычайна ўключаюцца ў сказ у якасці кампанентаў, якія не з'яўляюцца гал. і даданымі членамі, або выносяцца за межы сказа і выконваюць функцыю асобнага слова-сказа. Могуць субстантывавацца, пераходзіць у часціцы, служыць базай для ўтварэння дзеясловаў («ахаць», «нукаць», «ойкаць»). Ад В. трэба адрозніваць гукапераймальныя словы.

*Літ.*: Граматыка беларускай мовы. Т. 1. Марфалогія. Мінск, 1962; Кароткая граматыка беларускай мовы. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 2007. *С.У.Палашкевіч.*

**ВЫКУП**, старажытны вясельны абрад. У песнях, прымеркаваных да гэтага абраду, знайшлі ўвасабленне розныя гіст. эпохі і формы заключэння шлюбу, а таксама рытуальныя дзеі, што пераасэнсоўваліся адпаведна часу. У ранніх паэт. тэкстах з узброенай дружынай жаніха адбываюцца розныя метамарфозы: яна малюецца стральцамі, называецца ардой, ператвараецца ў «казакоў сем палкоў», а яе «баявы паход» за дзяўчынай параўноўваецца з татарск. нашэсцем. У сям'і маладой у гэты час рыхтаваліся да «вайны»: «вароты пазамыканы, заваламі пазавалены», перад імі раскладалі вогнішча, ляскалі сякерамі, косамі, піламі і інш. На двары трымалі варту: «Першая старожка ў варот стаіць, другая ж старожка — серадзі двара, а трэцяя старожка на ганачках стаіць». У канчатковым выніку дружына маладога пераадольвае ўсе перашкоды і захоплівае нявесту. З цягам часу «жыццёвая драма» выкрадання маладой ператварылася ў абрадавую гульню. Змяніўся змест песень, у некаторых з іх вясельнікі і маладая навучалі жаніха этыкету: ветлівасці, вытрымцы, цярплівасці, павазе да бацькоў маладой. Адносіны маладых набылі інш. танальнасць: нявеста чакала жаніха, які прывозіў ёй і цешчы чаравікі, а сёстрам маладой падарункі. Варожасць дружыны маладога нівеліруецца: у яе складзе з'яўляюцца «тры малойчыкі», «сем казачэнькаў», «семсот баяраў», «тры саколікі». У наш час В. — вясёлая, тэатралізаваная, гумарыст. дзея, у якой у «куплі-продажы» нявесты прымаюць удзел усе прысутныя, у т.л. і жаніх. «Таргуецца» з дружынай нявесты сват маладога. Ад яго кемлівасці, эрудыцыі, артыстычных здольнасцей залежыць ход гандлю. Для жаніха і яго дружыны рыхтуюць розныя заданні, выпрабаванні, адгадванні загадак, «доўгія таргі». Яму неабходна быць гатовым да розных сюрпрызаў з боку сяброўак нявесты: выкупіць ключ ад замка з ланцужком, якім перагароджаны ўваход да маладой, праявіць веданне яе характару, густаў і інш. За В. нявесты даюць грошы, цукеркі, гарэлку, шампанскае, кветкі і інш. Рытуальныя дзеі суправаджаюцца смехам, жартамі, танцамі, спевамі. *А.М.Аляхновіч.*

**ВЫЛАЗАЎСКАЯ ЦАРКВА РАСТВА БАГАРОДЗІЦЫ**, помнік архітэктуры драўлянага дойлідства ў в. Вылазы Пінскага р-на. Пабудавана ў 1787 на месцы папярэдняга храма. Да асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму прымыкае 5-гранная апсіда. Асн. аб'ём накрыты 4-схільным дахам са званападобным купалам на 8-гранным барабане ў завяршэнні. Гарызантальна ашаляваныя (цокаль вертыкальна) сцены расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў ліштвах з трохвугольнымі сандрыкамі. Уваход афармлены ў выглядзе невял. прытвора пад 2-схільным пакрыццём. Асобна ад царквы ўзведзена 2-ярусная зрубава-каркасная званіца пад шатровым гонтавым дахам. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каш-